Р.С.Матульскі, *дацэнт*

# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА І БІБЛІЯГРАФІЯ"

У нарматыўных дакументах Міністэрства адукацыі РБ, якія рэгламентуюць вучэбны працэс, час, адведзены студэнтам ВНУ для навучання, падзяляецца на аўдыторныя заняткі і самастойную работу. У Адукацыйным стандарце вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" вызначаны аб'ём аўдыторных заняткаў і самастойнай работы студэнтаў для вочнай формы навучання: 4935 гадзін, ці 67% часу, адведзена на аўдыторныя заняткі, а 2395 гадзін, ці 33%, — на самастойную работу студэнтаў. Зыходзячы з існуючых нарматываў фарміравання вучэбных планаў, можна вызначыць размеркаванне занятасці студэнтаў розных формаў навучання аўдыторнымі заняткамі і самастойнай работай (табл. 1).

*Табліца 1*

| Форма навучання | Колькасць гадзін | Аўдыторныя заняткі | | Самастойная работа | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | колькасць гадзін | % | колькасць гадзін | % |
| Вочная | 7330 | 4935 | 67 | 2395 | 33 |
| Вячэрняя | 7330 | 3665 | 50 | 3665 | 50 |
| Завочная | 7330 | 2119 | 30 | 5211 | 70 |
| Экстэрнат | 7330 | 0 | 0 | 7330 | 100 |

Разам з тым падрыхтоўка студэнтаў да аўдыторных заняткаў, асабліва семінарскіх і лабараторных, таксама патрабуе працы студэнтаў па-за межамі аўдыторнага часу. У адпаведнасці з нарматывамі Міністэрства адукацыі вучэбны

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

тыдзень студэнта раўняецца 54 гадзінам, з якіх на аўдыторныя заняткі навучэнцаў стацыянара адводзіцца 63% рабочага часу, а на пазааўдыторную работу 37%. Прымяніўшы дадзены падыход, можна разлічыць размеркаванне тыднёвай нагрузкі паміж аўдыторнай і пазааўдыторнай работай студэнтаў розных формаў навучання (табл. 2).

*Табліца 2*

| Форма навучання | Колькасць гадзін | Аўдыторныя заняткі, гадзіны | | | Пазааўдыторная работа | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | колькасць гадзін у перыяд навучання | колькасць гадзін у тыдзень | % | колькасць гадзін у тыдзень | % |
| Вочная, у тым ліку | 54 | 4935 | 34 | 63 | 20 | 37 |
| I—III курсы | 54 | | 36 | 66 | 18 | 34 |
| IV—V курсы | 54 | | 32 | 59 | 22 | 41 |
| Вячэрняя | 54 | 2460 | 17 | 31 | 37 | 69 |
| Завочная | 54 | 1645 | 11 | 20 | 43 | 80 |
| Экстэрнат | 54 | 0 | 0 | 0 | 54 | 100 |

Такім чынам, у адпаведнасці з нарматывамі Міністэрства адукацыі асноўная пазааўдыторная праца студэнтаў вочнай формы навучання з агульнага бюджэту часу (34%) прыпадае на самастойную работу, і толькі 3% на іншыя віды работ. У адпаведнасці з гэтымі прапорцыямі і неабходна планаваць заданні. У студэнтаў другіх формаў навучання доля пазааўдыторнай работы ў бюджэце часу паступова ўзрастае і дасягае 80% на факультэце завочнага навучання і 100% па форме экстэрнату.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Вочнае навучанне | xxxxxxxxxxxxxx | 37% |
| Вячэрняе навучанне | xxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxx | 69% |
| Завочнае навучанне | xxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxx | 80% |
| Экстэрнат | xxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxx | 100% |

Калі пагадзіцца з высновай, што асноўнай крыніцай інфармацыі на аўдыторных занятках з'яўляецца выкладчык, то пры пазааўдыторнай рабоце студэнт за інфармацыяй вымушаны звяртацца да розных крыніц. Сярод дакументаў, якімі ў першую чаргу карыстаюцца студэнты ў працэсе навучання, можна выдзеліць праграмы курсаў, вучэбна-метадычныя матэрыялы па падрыхтоўцы да семінарскіх, лабараторных, практычных і іншых відаў заняткаў (так званыя вучэбна-метадычныя комплексы), падручнікі і дапаможнікі, даведачныя і навуковыя выданні.

Праграма вызначае мэты і задачы курса, яго змест і патрабаванні да ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў па выніках навучання. Нягледзячы на тое, што да 1990-х гг. праграмы курсаў распрацоўваліся цэнтралізавана і ў выкладчыкаў факультэта не было неабходнага вопыту па іх распрацоўцы, зараз усе спецыяльныя дысцыпліны забяспечаны праграмамі курсаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца выкладчыкі факультэта. Факультэтам распрацавана доўгатэрміновая комплексная праграма падрыхтоўкі вучэбных праграм новага пакалення, якія адпавядаюць патрабаванням Адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці.

Разам з тым значная частка праграм выдадзена невялікім тыражом, і іх не хапае для студэнтаў усіх формаў навучання. Асаблівую патрэбу ў праграмах курсаў адчуваюць студэнты ФЗН, таму што іх час карыстання чытальнай залай бібліятэкі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

абмежаваны тэрмінамі экзаменацыйных сесій, а на абанеменце бібліятэкі яны адсутнічаюць.

Выкладчыкамі факультэта таксама па ўсіх курсах распрацаваны вучэбна-метадычныя комплексы, якія ўключаюць тэматыку семінарскіх заняткаў, заданні і неабходныя матэрыялы па выканані практычных і лабараторных заняткаў, кантрольных работ, заданні па самастойнай рабоце, тэматыку курсавых і дыпломных работ, пытанні для самакантролю, спісы асноўных і дадатковых крыніц. Названыя комплексы вучэбна-метадычных матэрыялаў дапамагаюць студэнтам пры падрыхтоўцы да бягучых заняткаў, а таксама пры ліквідацыі запазычанасці па тэмах, якія былі не засвоены. На жаль, усе гэтыя матэрыялы існуюць толькі ў машынапісным варыянце, знаходзяцца на кафедрах, і доступ да іх студэнтаў абмежаваны.

Па прычыне сацыяльна-палітычных рэформаў сітуацыя з падручнікамі па спецыяльнасці ў 1990-я гг. рэзка пагоршылася. Выдадзеныя ў савецкі перыяд, яны маральна ўстарэлі, а падрыхтоўка і выданне новых практычна перапыніліся. Разам з тым у апошнія гады ўдалося ў пэўнай ступені пераламіць негатыўныя тэндэнцыі ў гэтым кірунку. Дзякуючы эфектыўнаму механізму маральнага і матэрыяльнага заахвочвання аўтараў, аднаўленым сувязям з выдавецтвамі, налажаны выпуск падручнікаў па спецыяльных дысцыплінах. Так, толькі па курсах "Бібліятэказнаўства" і "Бібліятэчны менеджмент" на працягу трох апошніх гадоў выдадзены 11 падручнікаў і дапаможнікаў.

У сувязі з рознымі прычынамі, у тым ліку арганізацыйна-фінансавымі, вырашэнне праблемы забеспячэння студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры толькі за кошт замежных выданняў немагчыма. Так, з названай вышэй колькасці падручнікаў бібліятэкай універсітэта набыты толькі пяць. Але нават калі дапусціць, што фінансавыя і іншыя абмежаванні будуць пераадолены, то праблема не будзе

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

вырашана, таму што ў змесце спецыяльных дысцыплін значную частку займаюць нацыянальныя аспекты, бо эканоміка-прававыя і сацыяльныя асаблівасці развіцця Беларусі значна адрозніваюцца ад краін нават блізкага замежжа. Таму актуальнай для Беларусі з'яўляецца задача падрыхтоўкі падручнікаў па спецыяльных дысцыплінах з улікам нацыянальнай спецыфікі.

На жаль, на працягу апошняга дзесяцігоддзя выкладчыкамі факультэта было падрыхтавана толькі восем падручнікаў і дапаможнікаў па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія", з іх шэсць выдадзены, а два дэпаніраваны. Падрыхтаваныя ў рамках тэматыкі навуковых даследаванняў у 1998—2000 гг. тры дапаможнікі па дакументазнаўстве і бібліяграфіі, на жаль, не ўключаны ў план выдавецкай дзейнасці універсітэта. Такім чынам, можна канстатаваць, што на ўсіх узроўнях не ўдалося стварыць спрыяльных умоў для прыцягнення таленавітых навукоўцаў да падрыхтоўкі вучэбных выданняў і выпрацаваць механізм выдання падручнікаў і дапаможнікаў па спецыяльных дысцыплінах.

У сувязі з адсутнасцю нацыянальных падручнікаў значна ўзрастае роля навуковых і даведачных выданняў. Трэба адзначыць, што ў 2000 г. значна палепшылася праца бібліятэкі па фарміраванні фонду спецыяльнай літаратуры. Так, калі ў сярэдзіне 1990-х гг. у бібліятэку кожны год паступала па 15—20 назваў спецыяльных выданняў, то ў 2000 г. бібліятэка набыла каля 100 назваў спецыяльных выданняў. Разам з тым спецыяльныя часопісы па-ранейшаму набываюцца па адным—два экземпляры, у тым ліку часопіс "Бібліятэчны свет", які публікуе матэрыялы аб развіцці бібліятэчнай справы ў Беларусі, артыкулы выкладчыкаў спецыяльных кафедраў факультэта.

Выкладчыкам факультэта неабходна больш актыўна выкарыстоўваць разныя формы, у тым ліку навукова-практычныя канферэнцыі, для публікацыі лекцыйных

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

матэрыялаў. Дадзеныя публікацыі можна было б выкарыстоўваць у далейшым у якасці дадатковых вучэбных матэрыялаў. Гэта датычыцца толькі друкаваных крыніц па забеспячэнні самастойнай работы. У цяперашні час усё больш узрастае роля электронных дакументаў у забеспячэнні розных галін дзейнасці. У буйных універсітэтах Еўропы і Амерыкі нават ствараюцца электронныя бібліятэкі. Аснову такіх бібліятэк складаюць гіпертэкставыя БД, мультымедыйныя падручнікі і дапаможнікі, электронныя версіі навуковых прац. Студэнты і выкладчыкі такіх ВНУ карыстаюцца электроннымі рэсурсамі бібліятэкі свайго універсітэта праз персанальныя камп'ютэры ў лабараторыях і кабінетах ВНУ, а часцей за ўсё праз дамашнія персанальныя камп'ютэры. Праз сервер бібліятэкі карыстальнікі таксама атрымліваюць доступ да інфармацыйных рэсурсаў другіх ВНУ, бібліятэчна-інфармацыйных устаноў замежных краін. Пры гэтым універсітэт эканоміць фінансавыя сродкі, таму што стварэнне, набыццё і захоўванне электронных дакументаў значна танней, чым дакументаў на традыцыйных носьбітах.

Для стварэння і выкарыстання электронных дакументаў неабходна вылічальная тэхніка з адпаведным праграмным абсталяваннем, а пры арганізацыі работы ў рэжыме аддаленага доступу — і лінія сувязі. Зараз у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры працуе пяць камп'ютэрных лабараторый (у тым ліку адна на ФБІС), якія маюць неабходную тэхніку і праграмнае забеспячэнне для стварэння электронных дакументаў.

Выкладчыкамі кафедры зроблена шмат у гэтым кірунку. Значная частка вучэбна-метадычных матэрыялаў і навуковых прац рыхтуецца да выдання пры дапамозе ПК. Разам з тым не выконваецца рашэнне савета універсітэта аб стварэнні БД электронных копій выданняў універсітэта. У сувязі з гэтым электронныя версіі выданняў, як правіла, захоўваюцца ў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

прыватных архівах лабарантаў і выкладчыкаў, што вядзе да страты часткі іх і некарэктнага выкарыстання.

У бібліятэцы універсітэта створана камп'ютэрная сетка, якая можа стаць асновай для забеспячэння студэнтаў электроннымі дакументамі. Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры набыў сервер, які падключаны да Internet. Пры яго дапамозе студэнты і выкладчыкі праз камп'ютэрныя лабараторыі універсітэта атрымаюць доступ да інфармацыйных рэсурсаў другіх устаноў.

Але не трэба думаць, што стварэнне камп'ютэрнай сеткі і падключэнне яе да Internet вырашыць усе праблемы інфармацыйнага забеспячэння студэнтаў. Вылічальная тэхніка — гэта хаця і вельмі дасканалы, але толькі сродак. Пакуль што магчымасці Internet у інфармацыйным забеспячэнні спецыяльных дысцыплін невялікія. Такое становішча тлумачыцца тым, што нацыянальныя электронныя рэсурсы па бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі амаль адсутнічаюць. Гэта ж тычыцца і рускамоўных электронных рэсурсаў. Пакуль што на электронных носьбітах не выдаюцца ні навуковыя, ні вучэбныя матэрыялы па спецыяльнасці, і адпаведна яны не могуць быць выстаўлены ў Internet. У сусветнай інфармацыйнай сетцы не прадстаўлены таксама матэрыялы буйных навуковых канферэнцый. Са спецыяльных часопісаў web-старонкі маюць толькі два: расійскі "Библиография" і беларускі "Бібліятэчны свет". Безумоўна, у электронных сетках шмат матэрыялаў на замежных мовах, але яны нават пры зняцці ўсіх тэхнічных і фінансавых абмежаванняў будуць маладаступныя для большасці студэнтаў па прычыне моўнага бар'еру. Акрамя таго, такія матэрыялы маюць не першачарговую значнасць для вучэбнай дзейнасці.

Таму асноўнай задачай для выкладчыкаў факультэта ў гэтым кірунку з'яўляецца напаўненне рэальным зместам (у

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

поўным сэнсе гэтага слова) камп'ютэрнай сеткі бібліятэкі інфармацыяй па спецыяльных дысцыплінах.

Паколькі значная частка пазааўдыторнай работы, у тым ліку самастойная работа студэнтаў, ажыццяўляецца за межамі ВНУ (асабліва студэнтамі вячэрняй і завочнай формаў навучання, экстэрнату, а таксама студэнтамі стацыянара ў выхадныя і святочныя дні і падчас канікул), то самастойная работа непасрэдна звязана з дыстанцыйным навучаннем. Пры гэтым у якасці першай дыстанцыі неабходна разглядаць адлегласць паміж лабараторыямі адной кафедры, паміж кафедрамі, факультэтамі, іншымі падраздзяленнямі універсітэта, і толькі потым можна пераходзіць да міжвузаўскага, гарадскога, галіновага і нацыянальнага ўзроўняў. Міжнародны ўзровень (выхад са сваімі прадуктамі ў Internet) з'яўляецца найбольш высокім, і яго выкарыстанне мэтазгодна толькі пры адпаведных дасягненнях на папярэдніх узроўнях.

Для паляпшэння інфармацыйнага забеспячэння самастойнай работы неабходна:

1) стварыць механізм маральнага і матэрыяльнага заахвочвання аўтараў нацыянальных падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў;

2) наладзіць выданне падрыхтаваных выкладчыкамі факультэта падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў;

3) выкладчыкам спецыяльных дысцыплін актывізаваць работу па выданні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, а таксама раздрукоўцы вучэбна-метадычных матэрыялаў;

4) павялічыць тыраж вучэбна-метадычных матэрыялаў, у тым ліку за кошт арганізацыі выдавецкай дзейнасці на камерцыйнай аснове;

5) сістэматычна, а не час ад часу набываць у адпаведнасці з дзеючымі нарматывамі літаратуру па спецыяльнасці, асабліва падручнікі і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, якія выдаюцца ў Расіі і на Украіне;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

6) на базе сервера бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры стварыць web-старонку факультэта і паўнатэкставыя базы даных вучэбна-метадычных матэрыялаў, падрыхтаваных выкладчыкамі факультэта, для іх выкарыстання ва універсітэце;

7) падключыць камп'ютэрныя лабараторыі і бібліятэку універсітэта да Internet з мэтай забеспячэння доступу студэнтаў да інфармацыйных рэсурсаў іншых устаноў, у тым ліку замежных;

8) з падключэннем камп'ютэрных лабараторый і бібліятэкі універсітэта да Internet выставіць ў сетцы створаныя на факультэце інфармацыйныя прадукты для іх актыўнага выкарыстання студэнтамі ФЗН і іншых формаў навучання.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ